# БАГДАНОВІЧУ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА

Мастацка-графічны факультэт нашага ўніверсітэта – выдатная пляцоўка для правядзення розных выстаў. Магчымасць прадставіць свае работы на суд гледачоў ёсць як у выкладчыкаў факультэта, так і ў аспірантаў, магістрантаў, студэнтаў і школьнікаў. Так, напрыканцы лістапада на МГФ адкрылася рэспубліканская перасовачная выстава «Багдановіч. Маладыя жаданні...» у межах рэспубліканскага культуралагічнага праекта «Грани творчества». На выставе былі прадстаўлены работы прафесійных мастакоў і студэнтаў з 24 ВНУ нашай краіны, прысвечаныя жыццю і творчасці славутага беларускага паэта Максіма Багдановіча. Тут можна было пабачыць графіку, фатаграфіку, жывапіс, габелен, батык і інш.



На ўрачыстым адкрыцці прысутнічалі прарэктар па вучэбнай рабоце нашага ўніверсітэта В.І. Туркоўскі, дэкан МГФ Ю.П. Бежанар, прафесар кафедры выяўленчага мастацтва М.Л. Цыбульскі, студэнты, выкладчыкі і супрацоўнікі ВДУ імя П.М. Машэрава. Вершы Максіма Багдановіча чыталі дацэнт кафедры літаратуры В.Ф. Падстаўленка і паэт У.А. Папковіч.

З перасовачнай выставай можна было пазнаёміцца на працягу тыдня, затым яе перавезлі ў Баранавічы.

**УЛАСНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ.**

**На здымку:** верш чытае В.Ф. Падстаўленка.

**Фота В. ЛУЗГІНОЙ.**